# Хто ён, Іван Кандрацьеў?

Пра нашага суайчынніка — паэта, драматурга, раманіста, асветніка (1849 — 1904), які дэбютаваў на Віленшчыне, але асноўную частку жыцця правёў у Маскве, — даведаліся слухачы прафесара Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, доктара культуралогіі Аляксандра Смоліка. Разам з супрацоўнікамі Музея гісторыі беларускай літаратуры ён пазнаёміў грамадскасць з кнігай «Божы дар Івана Кандрацьева».

Ініцыятыва імпрэзы, адзначыў А. Смолік, паходзіла не ад яго, а ад зацікаўленых студэнтаў, з якімі ён шчыра дзяліўся ўражаннямі падчас даследавання спадчыны забытага суайчынніка, захоплены гэтай асобай і разуменнем яе месца ў нашай культуры. «Мы адкрываем нашаму народу яго гонар, яго культуратворчасць у асобе слаўнага беларуса Івана Кандрацьева, — адзначыў аўтар. — Нацыя можа ганарыцца такім самародкам».

І. Кандрацьеў паходзіць родам з вёскі Каловічы Віленскага павета, з беднай сялянскай сям'і. Быў забраны ў школу ваенных кантаністаў у Смаленску, потым пераведзены ў фельчарскую школу пры Санкт-Пецярбургскай медыка-хірургічнай акадэміі. Дзевятнаццацігадовым юнаком пачынае друкаваць вершы ў «Виленском вестнике», а хутка — тамсама — драмы. Працуе акцёрам у Віленскім тэатры. З 1872 года жыве ў Маскве, дзе выдае два зборнікі вершаў, шэраг аповесцей і раманаў, некалькі этнагістарычных прац, прысвечаных славутасцям Расійскай імперыі. Працуе і для дзяцей у якасці складальніка хрэстаматыі для чытання і ўнікальнай «энцыклапедыі» дзіцячых гульняў.

Пра інтэлектуальны і мастацкі ўзровень гэтых тэкстаў — у чаканні іх даследаванняў — сведчаць факты: супрацоўніцтва і сяброўства аўтара з асяроддзем знакамітых літаратараў і мастакоў (А. Саўрасаў, І. Сурыкаў, І. Левітан, А. Чэхаў, У. Гіляроўскі і інш.); апантанасць пісьменніка ідэямі філосафаў Сярэбранага веку (У. Салаўёў, Л. Карсавін); папулярнасць вершаў, пакладзеных на музыку («Очаровательные глазки», «По диким степям Забайкалья»); запатрабаванасць празаічных твораў пры жыцці і перавыданні шэрагу іх у наш час.

«Грамадскія ўзрушэнні, рэвалюцыі XX стагоддзя засланілі асобу Івана Кандрацьева, — разважае А. Смолік. — Ён не быў прыхільнікам дыктатуры пралетарыяту, стаяў за форму не-абсалютнай (парламенцкай) манархіі, якая эвалюцыйным чынам прыйшла б да агульнаеўрапейскай мадэлі дзяржаўнага кіравання». Сапраўды, спадчына І. Кандрацьева, дзе спрэс выкрываецца любы гвалт, не магла вабіць савецкае кіраўніцтва. Не было ў І. Кандрацьева нашчадкаў, каб потым, калі ўлада змянілася, хтосьці мог бы папулярызаваць яго творчасць. Беларускі чытач або навуковец, такім чынам, амаль не мелі шанцу заўважыць суайчынніка, бо той пісаў на рускай мове і пераважна на рускія сюжэты (хоць пра радзіму ніколі не забываўся: перакладаў беларускі фальклор, рабіў месцам дзеяння шэрагу твораў «тутэйшую» ўскраіну Расійскай імперыі).




Прафесар А. Смолік выпадкова трапіў на адну з кніжак І. Кандрацьева — нарыс жыцця і творчасці А. С. Пушкіна. Заінтрыгаваны арыгінальнасцю тэксту, а потым — фактам, што аўтар аказаўся яго земляком, навукоўца пачаў разблытваць клубок кандрацьеўскага лёсу і раскіданых па расійскіх бібліятэках яго тэкстаў. «Упэўнены, што мяне вёў Бог», — шчыра кажа даследчык, заклікаючы культуролагаў і філолагаў далучыцца да ганаровай справы адкрыцця новай зоркі ў літаратуры Беларусі.

**Таццяна СТУДЗЕНКА**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ